**УДК 821.161.3.09**

# СПЕЦЫФІКА БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ МАСТАЦКАЙ І ПУБЛІЦЫСТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ М. ГАРЭЦКАГА)

***канд. філал. навук З.І. ТРАЦЦЯК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца Нацыянальнае Адраджэнне – адна з тэм, што вызначае творчыя пошукі М. Гарэцкага. Яна знайшла адлюстраванне ў літаратурна-мастацкай, навуковай і публіцыстычнай спадчыне аўтара. Пісьменнік акцэнтаваў увагу на этнічных беларусах: персанажах, што па-рознаму ставіліся да сваёй прыналежнасці да дадзенага народа. Прыярытэтнымі для М. Гарэцкага засталіся стасункі інтэлігента-беларуса, што займаўся абуджэннем нацыянальнай свядомасці, і шараговага селяніна, які вагаўся ў вырашэнні дадзенага пытання. Пісьменнік стварыў вобразы «рэнегатаў» – дзейных асоб, што парывалі з продкамі, кіруючыся амбіцыйнымі матывамі. У сукупнасці іх палярныя погляды вызначаюць спецыфічныя рысы, што характарызуюць нацыянальную самасвядомасць беларуса. Паказана, што акрамя традыцыйнай патрэбы ў самарэфлексіі, цікавасці да «патаёмнага», далікатнасці і прагі да ведаў, М. Гарэцкі вылучае здольнасць да прыстасаванства і прыніжэння ўласнай і агульнанароднай годнасці.*

**Уводзіны.** У першай трэці мінулага стагоддзя слова стала адным з дзейсных сродкаў барацьбы за адраджэнне душы беларуса. Літаратарам, публіцыстам, грамадскім дзеячам і навукоўцам (М. Гарэцкі, Я. Колас, Я. Купала, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, І. Луцкевіч, А. Цвікевіч і інш.) прыходзілася змагацца і з варожа настроенымі прадстаўнікамі суседніх этнасаў, і са скептыкамі-«тутэйшымі», якія не ўспрымалі сябе прадстаўнікамі асобнага народу са сваёй унікальнай культурай і традыцыямі. М. Гарэцкі ў артыкуле «Наш тэатр» зазначыў: «Беларус – гэта Хомка, што веры не дае» [1, с. 579]. Таму, каб пераканаць яго, спатрэбіліся творы розных жанраў. Характэрнай для публіцыстыкі і мастацкай літаратуры таго часу была наступная тэматыка: даўняя напаўзабытая гераічная гісторыя нацыі, дасягненні славутых прадстаўнікоў этнасу, самабытнасць мовы, стварэнне нацыянальна арыентаванай сістэмы адукацыі, актуальныя аспекты культурнага жыцця, грамадскія праблемы, рысы характару і побыт беларуса, драматызм суіснавання з іншымі народамі.

Літаратурна-мастацкая, навуковая і публіцыстычная спадчына М. Гарэцкага спалучыла практычна ўсе згаданыя аспекты, але найбольш значным быў унёсак пісьменніка ў раскрыццё існасці душы беларуса. Яе сутнасць інтэрпрэтавалася праз катэгорыю «патаёмнае». Аўтарскае азначэнне часткова адпавядала паняццю «містыцызм» і нагадвала пра спрадвечнае жаданне «шукаць кон як неспазнаную, неадгаданую сілу быту» [2, с. 133]. М. Гарэцкі бачыў, што мастацкае ўвасабленне самасвядомасці беларуса патрабуе комплекснага падыходу. Пісьменнік стварыў галерэю вобразаў, якія выявілі розныя аспекты нацыянальнага характару і светаадчування. Па-за ўвагай не засталіся ні беларусы-сяляне і інтэлігенты ў першым пакаленні, ні абывацелі і арыстакраты, што выракліся ўсяго роднага.

**Асноўная частка.** М. Гарэцкі закрануў далікатнае пытанне, бо ідэя беларускасці і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі была ахутана шэрагам міфаў і стэрэатыпаў. Нацыі адмаўлялі ў праве на існаванне, з пагардай разважалі пра яе «наречие», паблажліва ставіліся да яе мінулага. «Сапраўдны» беларус атаясамліваўся з працай на зямлі, галечай і неўпарадкаваным побытам, а рух за адраджэнне асабістай і нацыянальнай годнасці, гістарычнай памяці – не з чым іншым, як з «дзівам»: «Беларускі рух … Што гэта за дзіва? Што яшчэ за праява – адраджэнне белых русічаў? … Скуль яно, тое дзіва, пайшло, адкуль узялося?» [3, с. 179]. Паводле М. Гарэцкага, яно ўзнікла ў гушчы народнага быцця і звязана з селянінам – носьбітам і выбітнага, і заганнага. Паказальна, што мастак слова не ідэалізаваў беларуса, які «за доўгія вякі няволі аглох і зрабіўся нячулым» [4, с. 119]. Празаік улічваў знешнія фактары, што перашкаджалі адчуць самабытнасць, але ён не пакідаў па-за ўвагай жаданне прыстасавацца да абставін, выбіцца ў людзі нявартымі шляхамі.

Складаным М. Гарэцкаму падавалася адраджэнне годнасці і нацыянальнай самасвядомасці селяніна, з якога некалькі стагоддзяў «жыццёвага амбарасу зрабілі быдліну» [5, с. 132]. Прымус, праца, хваробы, здзек не пакідалі часу на разважанні над адцягненнымі паняццямі. Гэта было праблематычна, бо беларус не ўяўляў, на якой мове выкласці думкі: вольна размаўляць «па-панску» ён звычайна не мог, а часам і не імкнуўся да гэтага. На жаль, сваё слова было аб’ектам з’едлівых заўваг; апаганенае чужынцамі, яно адышло на перыферыю адукацыйнага працэсу (аповесць «Ціхая плынь», асобныя раздзелы «Камароўскай хронікі»). Ад нараджэння надзелены творчымі здольнасцямі, «патэнцыяльнай здатнасцю да культуры, сваім розумам і далікатнасцю» [6, с. 56] персанаж шукаў альтэрнатыўныя сродкі, каб увасобіць перажыванні. Імі станавіліся самотныя сненні-трызненні, заняткі музыкай, назіранне за прыродай.

Прыступкай да асэнсавання і індывідуальнай, і нацыянальнай самасці і годнасці была адукацыя. М. Гарэцкі падкрэсліваў яе прывабнасць для шараговага беларуса. Веды і набытая прафесія ў некаторых выпадках атаясамліваліся з нябачным мурам, што хаваў новаспечанага інтэлігента ці абываценя ад мужыцкай масы, якой ён занадта лёгка навучыўся пагарджаць. Сітуацыя каларытна пададзена ў артыкуле «Будзённыя з’явы». Малады паліцэйскі надзірацель цураецца бацькоў і родных: «ён выйшаў у панства, а яны што? – “мужычо” … Як жа яму прызнацца, ідучы пад ручку з паненкай, што насустрэчу ў белай сярмяжцы цюхціць яго бацька?» [7, с. 165]. Повязь з «родным карэннем» гвалтоўна парывалася, але персанаж-«рэнегат», паводле пісьменніка, не адчуваў сябе «сваім» у штучна прыўласненым асяроддзі: «так і прамарудзіць задарма жыццё сваё: ні Богу свечка, а ні чорту чапяла, ні пан, ні нашчанец, мужыцкі брат» [8, с. 38]. Такія паводзіны, псіхалагічны стан больш-менш зразумелыя суайчыннікам-сялянам, якія не назалялі «сынам». Яны вярталіся самі і «”прымазваліся” да беларусаў» [9, с. 113], кіруючыся прагматычнамі матывамі (князь Гальшанскі («Дзве душы»), безыменны вярбоўнік (апавяданне «У 1920 годзе»)). Падобныя авантурысты дыскрэдытавалі ідэю нацыянальнага адраджэння. Іх выказванні («Я … не шаную гэтай мовы: дык, няхай, чаго … адно свінства!», «Вы там прымаеце ўсё ўсур’ёз і думаеце, што мы сапраўды робім тут якуюсь Беларусь! Гэта ж адна камедзія …» [9, с. 117]) выклікалі пачуццё агіды. Было зразумела, што адзіны імператыў, якім яны кіраваліся, звязаны з жаданнем захаваць жыццё ў зменлівых абставінах.

Драматычна складваліся адносіны беларуса-селяніна і інтэлігента ў першым пакаленні, што не забыўся на гаротнае быццё жыхара вёскі. У дадзеным выпадку ўзнік кагнітыўны дысананс: ніводны бок не ведаў, як успрымаць адзін адно. Адукаваная асоба адчувала сябе «прымакам у … “панстве” і пасынкам у вёсцы» [10, с. 22], а яго суайчыннікі намагаліся зразумець, чаму чалавек адмаўляўся ад пасады, грамадскай ухвалы на карысць барацьбы за ідэю, што, здавалася, практычна не мела прыхільнікаў. Паводле І. Чыгрына, «народ яшчэ толкам не знаў, з якога боку падыходзіць да інтэлігента, чужы ён яму ці свой» [11, с. 31]. «Наладжванне» ўзаемаадносін было павольным і не заўсёды эфектыўна скіраваным. Селянін і абывацель звычайна невысока ацэньвалі захады адукаваных беларусаў. Удасканаленне побыту, укараненне найноўшых сельскагаспадарчых прылад, асобныя маральна-этычныя пытанні, развіццё моладзі – асноўныя праблемы, што выклікалі непаразуменне і спрэчкі. Трагедыю сапраўднай інтэлігенцыі часоў Першай сусветнай, рэвалюцыі, заўчасна скасаванага нацыянальнага будаўніцтва шараговы беларус звычайна разглядаў так: «Дык паны ў няшчасці заўсёды болей халяруюць, чымся просты чалавек» [12, с. 575]. Натуральныя прычыны «халяравання» (будучыня этнасу, Асобы) засталіся неўсвядомленымі, а барацьбіты за Адраджэнне не дачакаліся сапраўднай павагі і спачування. Склаўшайся сітуацыяй актыўна карысталіся сілы, што мелі на мэце асіміляцыю беларусаў.

Інтэлігент адчуваў, што ў ім жывуць «дзве душы»: адна імкнулася да здабыткаў цывілізацыі, самаўдасканалення, гармоніі з сусветам, другая гарнулася да «свайго», спачувала продкам і сучаснікам з «Северо-Западного края». Дачыненне да «роднага карэння» фармулявалася так: «Вёска … Я ж яе люблю, але дзіўнаю любоўю, каторая найляпей азначаецца … прыказкай: нудна ўрозні, цесна разам. Люблю і ненавіджу разам» [8, с. 82]. Прыязнасць перамагла, і герой прысягнуў на слугаванне Радзіме. Гэтага яму не даравалі апалагеты імперскіх каштоўнасцей. Беларус-інтэлігент бачыў іх асімілятыўныя захады, але захоўваў нацыянальную ідэнтычнасць і практычна не зважаў на знявагі. У адрозненне ад апанентаў, ён не звяртаўся да агрэсіі, каб адстаяць мінімальныя правы. Адным з годных сродкаў барацьбы супраць стэрэатыпаў, прыстасавальніцтва і абыякавасці быў гумар. Інтэлігент-беларус лічыў свой «дзіўна-іранічны тон, … інтанацыю смеху скрозь слёзы» [13, с. 38] праявай сувязі з народам, які выпрацаваў гэты ахоўны механізм. Жарт ратаваў аднаго з улюбёных персанажаў пісьменніка – Алеся Пісарэвіча (п’еса «Жартаўлівы Пісарэвіч»). Ён дазваляў сціплымі лінгвістычнымі сродкамі ёміста сфармуляваць сутнасць праблемы, у прыхаванай форме выказаць меркаванне, параду, крытычную заўвагу. Меланхолія («хвароба суму і нуды» [14, с. 99]) характарызавала жыццё інтэлігента. Няздольны знайсці падрымку, ён прыходзіў да высновы, што страціў сэнс існавання. Адчуванне незапатрабаванасці і адзінота выклікалі думкі пра самагубства, але персанаж (Лявон і Лаўрык Задумы) не выконваў радыкальны намер. Своеасаблівымі лекамі былі сорам за ўласную слабасць і эгаізм, стваральная праца, дапамога родным ці аднавяскоўцам. Няварта забывацца на дзённікавыя запісы, размовы і ліставанне з нешматлікімі таварышамі.

Беларус-інтэлігент склаў спецыяльную праграму самаўдасканалення, якая дапамагала яму змагацца з меланхоліяй, а часам і з эгацэнтрызмам. Звышмэтай было гарманічнае развіццё асобы, што не забывалася на фізічныя і духоўныя патрэбы. Звяртаючыся да малодшага брата, Лявон Задума раіў, каб «Лаўрык не зачытваўся … белетрыстыкаю, … а каб разнаабразіў сваё чытанне кнігамі па прыродазнаўству, сельскай гаспадарцы, гісторыі, геаграфіі. Каб ён вывучаў чужаземныя мовы. Каб ён быў рэпетытарам, вучыў якога-небудзь беднага хлопчыка, хоць бясплатна. … Купіў бы канькі, вучыўся б на чым-небудзь іграць, навучыўся б скакаць … » [14, с. 98]. Персанаж разумеў, што яго план не меў універсальнага характару, не мог пазбавіць ад рэцэдываў «хваробы суму і нуды». Назіранні падобнага кшталту дазваляюць меркаваць, як выглядалі ўяўленні нацыянальнай інтэлігенцыі пра «звышчалавека».

Асобна М. Гарэцкі разглядаў лёс тых беларусаў па паходжанні, якія не «вызначаліся». Яны былі «пабочнымі глядзеннікамі і ціхімі думаннікамі» [8, с. 57], што здалёк назіралі за барацьбой розных груповак за душу народа, але цалкам не ідэнтыфікавалі сябе з ім, ці ганарліва заўважалі: «Бацькаўшчына – матка-Беларусь? … Выбачайце, … але мая бацькаўшчына – уся Расія» [8, с. 33]. Яскравым прыкладам персанажа, што пэўны час трымаўся нейтралітэту ў справе Адраджэння быў Ігнат Абдзіраловіч («Дзве душы»). Высветліўшы таямніцу паходжання, герой наноў прааналізаваў мінулае, усвядоміў, што асобныя рысы яго характару (патрэба ў самарэфлексіі, цікавасць да вытокаў быцця, спрадвечнае адчуванне віны) назаўжды звязалі яго з продкамі. Повязь не знікла нават пад уплывам выхавання, адукацыі, вопыту, набытага ў нетыповых для беларуса абставінах. Гэта была пачатковая кропка ў падарожжы да сваёй новай існасці, першы крок на шляху вяртання да народа.

Пісьменнік своеасабліва ставіўся да персанажаў-беларусаў, што не мелі ўнутранага маральна-этычнага стрыжню. Падобныя дзейныя асобы прыстасоўваліся да запатрабаванняў улады. За час іх жыцця нараджаліся звыродныя камбінацыі, што нельга было вытлумачыць законамі звычайнай логікі. Адна з дзейных асоб аповесці «Дзве душы» – Карпавіч (Гаршчок) – чалавек, што «ў пачатку вайны троху чаго не зрабіўся самым ярым ісціна рускім патрыётам, потым пад уплывам сваіх знаёмых студэнтаў – свядомых беларусаў – дужа скора асцюдзянеў. І нічога дзіўнага, што за недаўгі час перамахнуў ён аж да бальшавіцкага лагера» [8, с. 46]. Метамарфозы, мабыць, працягнуліся б, калі б Карпавіч не знайшоў ідэю, што ўладарна збірала апалагетаў і жорстка вынішчала антаганістаў. З гэтага асяродку выходзілі адданыя барацьбіты супраць парасткаў беларускага Адраджэння, якое яны лічылі праявай контррэвалюцыі. М. Гарэцкі не адмаўляў падобным персанажам у праве на згрызоты сумлення. Спарадычна яны ўсё ж адчувалі ўласную віну перад іншымі. Прыкрасць нейтралізавалася парадаксальным чынам: гарэлкай, ваяўнічымі прамовамі, карнымі экспедыцыямі на вёску, самашкадаваннем, што нагадвала самаразбурэнне. Грамадска-палітычная сітуацыя не пакідала адраджэнцам шанцаў у барацьбе супраць падобных «герояў». Яны атрымалі ўсебаковую падтрымку і ўхвалу новай улады, што не саромілася карыстацца іх паслугамі. Адзначым, што ў творчасці пісьменніка вобраз прыхільніка сацыялістычных ідэй неабавязкова афарбаваны выключна адмоўна. Так, Васіль («Дзве душы») ці Мацей Мышка (раман «Віленскія камунары») паўстаюць у іншым ракурсе: у адрозненне ад Карпавіча, яны не забыліся на асноўныя гуманістычныя каштоўнасці.

Выпрабаваннем для беларускага этнасу сталіся падзеі першай трэці мінулага стагоддзя. Войны і рэвалюцыі абвастрылі нацыянальнае пытанне. М. Гарэцкі ведаў, як складана захаваць мову, традыцыі, асобныя рысы характару. Логіка гістарычнага развіцця прыводзіла да абсурдных вынікаў: беларус мог забыцца / не ведаць пра сваю этнічную прыналежнасць. Земляроб з Магілёўшчыны, пакутуючы на ваенны неўроз, паўтараў «Я рускі! Я рускі! Рускі! Рускі!» [15, с. 154]. Так сталася, бо, з аднаго боку, селяніна занадта доўга вучылі пагарджаць родным, з другога, ён усё часцей пакідаў Беларусь у пошуках лепшай долі. Нацыя пачала губляць сыноў яшчэ да пачатку XX стагоддзя («Дзве душы»), але менавіта ў 1900–1930-я ггады гэты працэс стаў стыхійным і катастрафічным. У асноўным ён закрануў вясковую моладзь, што кіравалася ў прамысловыя цэнтры імперыі, трапляла ў войска, ехала ў ЗША, станавілася бежанцамі ці рэпрэсаванымі. Яна не паспявала засвоіць асновы беларускасці, якія звязаны з сузіраннем родных краявідаў, знаёмствам з фальклорам, назапашаным на роднай мове. Малады беларус звычайна нават не чуў, што «берагчы ў пашане сваё, гэта значыць гарманічна сумясціць сваё з чужым, з агульначалавечым» [16, с. 100]. М. Гарэцкі засвоіў ідэю і прапагандаваў яе як у мастацкай творчасці і публіцыстыцы, так і навуковай спадчыне. Напрыклад, ствараючы «Гісторыю беларускае літаратуры», ён памагчымасці разглядаў асноўныя перыяды станаўлення нацыянальнага прыгожага пісьменства на фоне здабыткаў слоўнасці іншых народаў.

**Заключэнне**. Задума М. Гарэцкага прасачыць асноўныя этапы станаўлення беларускай нацыянальнай самасвядомасці не знайшла лагічнага заканчэння. Аўтарская канцэпцыя рэканструюецца ў выпадку «скразнога» прачытання дакументальна-мастацкай, публіцыстычнай і навуковай спадчыны класіка. Грамадскі дзеяч і мастак слова вылучаўся аб'ектыўным стаўленнем да мінулага і сучаснага стану народа. М. Гарэцкі адмовіўся ад штучнага захаплення этнаграфічна-фальклорным складнікам. Яго аповеды пра штодзённы побыт вёскі, пададзеныя ў аповесцях «Ціхая плынь» і «Дзве душы», уражваюць асобнымі натуралістычнымі дэталямі. Назіранні прасякнуты болем за незайздросны стан беларуса. М. Гарэцкі не шукаў спачування: шакіруючы чытача-сучасніка ён спрабаваў абудзіць пачуццё нацыянальнай годнасці.

Аўтар абраў неардынарны падыход: падаў погляды на беларускасць і беларускае розных прадстаўнікоў этнасу (ад сялян і «народных людзей», звычайна інтэлігентаў у першым пакаленні, да арыстакратаў, што паспелі забыцца на свае карані). Асаблівую ўвагу пісьменнік надаваў вобразу беларуса, які прысвяціў жыццё Адраджэнню. Звычайна гэта адукаваны персанаж, што ўсведамляў свае супярэчлівыя адносіны да Радзімы (матыў захаплення-нянавісці). У сталай творчасці пісьменніка

заўважаецца шэраг дзейных асоб-сялян, якія ўслед за сапраўднай беларускай інтэлігенцыяй, працавалі на карысць нацыянальнага будаўніцтва (Кузьма з апавядання «Усебеларускі з'езд 1917-га года»).

ЛІТАРАТУРА

1. Гарэцкі, М. Наш тэатр / М. Гарэцкі // Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – С. 579–587.
2. Шантыр, Ф. Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэнне народа / Ф. Шантыр // Растраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – С. 123–137.
3. Гарэцкі, М. Развагі і думкі / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 179–198.
4. Гарэцкі, М. Фантазія / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 118–120.
5. Гарэцкі, М. Ціхая плынь / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. − Т. 2 : Аповесці. Драматычныя абразкі. – С. 124–182.
6. Лёсік, Я. Родная мова і яе значэнне / Я. Лёсік // Расстраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі, прадм. А. Сідарэвіча, камент. М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – С. 55–64.
7. Гарэцкі, М. Будзённыя з'явы / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 164–165.
8. Гарэцкі, М. Дзве душы / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 6–106.
9. Гарэцкі, М. У 1920 годзе (Апавяданне народнага чалавека) / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 113–118.
10. Гарэцкі, М. У чым яго крыўда? / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. − Т. 2 : Аповесці. Драматычныя абразкі. – С. 7–52.
11. Чыгрын, І. Паміж былым і будучым. Проза Максіма Гарэцкага / І. Чыгрын. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 165 с.
12. Гарэцкі, М. Жартаўлівы Пісарэвіч / М. Гарэцкі // Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – С. 553–576.
13. Корань, Л. Максім Гарэцкі / Л. Корань // Цукровы пеўнік. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – С. 22–65.
14. Гарэцкі, М. Камароўская хроніка / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. − Т. 4. – С. 5–309.
15. Гарэцкі, М. Рускі / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. − Т. 1 : Апавяданні 1913 – 1930. – С. 154–158.
16. Цвікевіч, А. Вялікае спрашчэнне, ці Вялікае ўдасканаленне / А. Цвікевіч // Расстраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – С. 97–100.

*Паступіў 24.06.2015*

**SPECIFIC CHARACTER OF THE BELARUSIAN NATIONAL SELF-CONSCIOUSNESS (ON M. HARETSKY'S LITERARY AND JORNALISTIC HERITAGE)**

***Z. TRATSIAK***

*In the article Belarusian national Renaissance as one of the topics which conditions M. Haretsky's artistic exploration is considered. It is depicted in the author's literary, scientific and journalistic heritage. The writer drew his readers' attention to the ethnic Belarusians. They were the characters who treated their own belonging to the nation in different ways. M. Haretsky's priority was the depiction of the interconnection between Belarusian intellectuals (who were rousing national consciousness) and common peasants (who hesitated in solving the following problem). The author created some 'renegade' images. They were the ambitious characters who had forgotten their ancestors. All in all their contrary points of view determine the specific features which characterize Belarusian national self-consciousness. The author indicated that except the traditional necessity of self-reflectivity, interest in 'the mysterious', delicacy and thirst for knowledge, M. Haretsky pointed out the ability of timeserving and humiliation of personal and national dignity.*